Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце
_______________ С.Л. Шпарло
07.07 2023
Рэгістрацыйны № УД-6-18-3/вуч.

# СОЛЬНЫЯ СПЕВЫ

*Вучэбная праграма установы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
6-05-0215-08 Мастацтва народных спеваў

2023

Вучэбная праграма складзена на аснове вучэбнага плана па спецыяльнасці 6-05- 0215- 08 Мастацтва народных спеваў, зацверджанага 15.02.2023 № 6-05-02-17/23уч.

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

*П.А.Базылева,* выкладчык кафедры народна-песеннай творчасці і фальклору ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”;

*Л.В.Снапкова,* дацэнт кафедры народна-песеннай творчасці і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*І.А.Змітрукевіч,* загадчык практычным навучаннем установы адукацыі “Мінскі каледж мастацтваў”;

*А.А.Нечай,* кандидат искусствоведения, доцент, заведующий кафедрой хоровой музыки учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств».

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* народна-песеннай творчасці і фальклору ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол №12 ад 30.05.2023);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 7 ад 05.07.2023).

**САГЛАСАВАНА**

Дырэктар Палаца культуры Мінскага трактарнага завода

________________________Н.В.Козун

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна “Сольныя спевы” займае важнае месца ў комплексе прафілюючых вучэбных дысцыплін спецыяльнасці “Мастацтва народных спеваў”. Выканаўца народнай песні павінен валодаць манерай спеваў, блізкай да носьбітаў песеннага фальклору; творча падыходзіць да вырашэння важнай праблемы сучаснасці па захаванні, развіцці і прапагандзе прагрэсіўных традыцый народна-песеннага выканаўства; садзейнічаць павышэнню ўзроўню вакальна-выканальніцкага майстэрства.

Вучэбная дысцыпліна “Сольныя спевы” звязана з такімі вучэбнымі дысцыплінамі, як “Выканальніцкае майстэрства”, “Аранжыроўка і расшыфроўка народнай песні”, “Асновы сцэнічнага руху”, “Акцёрскае майстэрства”, “Гісторыя вакальнага мастацтва, і інш.

Навучанне народным спевам дае студэнтам неабходныя веды і ўменні, якія дапамагаюць ім авалодаць сваёй прафесіяй.

Вучэбная дысцыпліна «Сольныя спевы» павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў наступныя групы кампетэнцый:

УК – 5. Быць здольным да самаразвіцця і ўдасканальвання прафесійнай дзейнасці, працаваць самастойна, разумець месца і ролю сваёй прафесіі у сучаснай сацыякультурнай прасторы.

УК – 6. Праяўляць ініцыятыву і адаптавацца да змяненняў у прафесійнай дзейнасці.

УК – 16. Увасабляць культурна-асветніцкія ідэі праз прафесійную дзейнасць.

БПК – 10. Выконваць сачыненні розных форм, стыляў і жанраў, ствараць іх мастацкую інтэрпрэтацыю

*Мэты вучэбнай дысцыпліны “Сольныя спевы”:*

– засваенне практычных навыкаў сольных спеваў у беларускай народнай манеры выканання;

– азнаямленне з песеннымі традыцыямі розных рэгіёнаў Беларусі;

– авалоданне акцёрскім майстэрствам і элементамі народнай харэаграфіі;

– фарміраванне музычнага густу і творчага падыходу ў стварэнні мастацкага вобраза народнай песні;

– выхаванне творчай асобы.

*Асноўныя задачы вучэбнай дысцыпліны:*

– вырашэнне пытанняў ідэйна-выхаваўчай работы (эстэтычнае, маральнае, патрыятычнае выхаванне студэнтаў);

– прафесійнае авалоданне тэхналогіяй спеваў у народнай манеры;

– засваенне методыкі навучання народным спевам.

Практычнае авалоданне асаблівасцямі народнага выканаўства ажыццяўляецца на аснове вывучэння беларускага песеннага фальклору, апрацовак народных песень, арыгінальных (аўтарскіх) твораў, напісаных з улікам народна-песенных выканальніцкіх традыцый, і мае творчы, імправізацыйны характар. Асаблівую ўвагу неабходна звярнуць на спосаб гукавядзення, рэгіянальныя гаворкі, выканальніцкія прыёмы (гульня словам і гукам у народных выканаўцаў, спосабы перадачы мелізмаў, гукавых скатаў на заканчэнні фраз, агласоўка зычных і інш.), сродкі выразнасці (інтанацыйныя, тэмбравыя, дынамічныя). Засваенне народна-выканальніцкіх прыёмаў мае пераймальны характар, таму неабходна звяртацца да духоўных вытокаў, якія трэба асэнсаваць, выкарыстоўваючы мастацкае ўяўленне. Тое ж тычыцца і рэгіянальных гаворак, асаблівасці якіх уплываюць на народную манеру выканання. Сапраўднасць народна-песеннага выканаўства – гэта перш-наперш праўдзівасць пачуццяў выканаўцы.

Пасля вывучэння вучэбнай дысцыпліны “Сольныя спевы” выпускнік павінен *ведаць:*

– механізм гуказдабывання і гукавядзення ў народнай манеры спеваў;

– тэхніку правільнага песеннага дыхання;

– народна-песенныя выканальніцкія прыёмы;

– тэхналогію засваення народнай манеры спеваў;

– рэгіянальныя асаблівасці народна-песеннага выканальніцтва.

*умець:*

– свабодна і прафесійна валодаць народнай манерай спеваў;

– карыстацца вакальна-тэхнічнымі сродкамі народнай манерай спеваў;

– выкарыстоўваць сродкі мастацкай выразнасці для перадачы зместу выконваемага вакальнага твора;

– выконваць творы “а капэлла” і з суправаджэннем;

– карыстацца прынцыпамі падбору рэпертуару;

*валодаць:*

- тэхнікай вакальнага выканальніцтва (пеўчай устаноўкай дыханнем на апоры, дыкцыйнымі навыкамі, навыкамі дакладнай і яснай артыкуляцыі, роўнасцю гучання голасу на працягу ўсяго дыяпазону голасу);
- навыкамі мастацкай выразнасці выканання: праца над словам, раскрыццё мастацкага зместу і выяўленне стылістычных асаблівасцяў твора (фразіроўка, нюансіроўка, агогіка, прыёмы ўваходжання ў музычны вобраз, сцэнічная, мімічная выразнасць).

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны "Сольныя спевы" адведзена ўсяго 960 гадзіны, з іх 524 гадзін - аўдыторныя (індывідуальныя) заняткі. Рэкамендаваныя  формы кантролю ведаў студэнтаў – залікі, экзамены.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛА

## Уводзіны

Мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны «Сольныя спевы». Сувязь з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі. Роля вучэбнай дысцыпліны ў падрыхтоўцы спецыяліста вышэйшай кваліфікацыі. Вучэбна-метадычнае забеспячэнне дадзенай дысцыпліны.

## Раздзел І. Развіццё практычных навыкаў сольных спеваў у народнай манеры

### *Тэма 1. Вызначэнне тыпу і характару голасу, тэмпераменту, артыстычных і музычных даных, індывідуальных недахопаў*

Замацаванне песеннай устаноўкі і развіццё правільных навыкаў спеваў: мяккай атакі гуку, плаўнага і роўнага гукавядзення, дакладнай перадачы мелодыі (рытму, вышыні гуку, фразіроўкі, эканомнай артыкуляцыі, натуральнага вымаўлення слоў).

### *Тэма 2.* Набыццё навыкаў правільнага песеннага дыхання

Дыханне песеннае і фізіялагічнае: агульныя рысы і адрозненне. Засваенне апоры дыхання. Развіццё навыкаў апоры гуку. Авалодванне рознымі тыпамі дыхання. Ніжнярэберна-дыяфрагматычны тып дыхання. Практыкаванні, якія садзейнічаюць умацаванню дыхальных мышцаў.

### Тэма 3. *Вызваленне галасавога апарату ад напружанага гучання*

Фарміраванне свабодных рухаў ніжняй сківіцы. Атака гуку. Тры тыпы атакі гуку. Засваенне мяккай, цвёрдай і прыдыхальнай атак гуку. Авалодванне метадамі народнага выканаўства. Засваенне ўсіх відаў атак: мяккай, цвёрдай, прыдыхальнай. Праца над мастацкім вобразам.

### *Тэма 4. Удасканальванне дыкцыі, праца над словам*

Знаёмства з асаблівасцямі вымаўлення галосных і зычных гукаў у спевах. Артыкуляцыйны апарат. Авалодванне свабоднай працай артыкуляцыйнага апарату. Фарміраванне дакладнай дыкцыі. Знаёмства з тэхналогіяй вымаўлення галосных і зычных гукаў у дыялектах розных рэгіёнаў Беларусі.

## Раздзел II. Засваенне тэхнікі сольных спеваў і вакальнага майстэрства

### *Тэма 5. Развіццё практычных навыкаў спеваў*

Выпрацоўка чыстай інтанацыі. Засваенне роўнага і плаўнага гукавядзення на невялікім дыяпазоне. Выпрацоўка навыкаў спеваў у народнай манеры ў межах квінты, сексты, сэптымы для жаночых галасоў; у межах сэптымы, актавы для мужчынскіх.

### *Тэма 6. Развіццё груднога рэзаніравання*

Знаёмства з рэгістрамі голасу. Засваенне прыёмаў спеваў "адкрытым" гукам. Праца над высокай пазіцыяй гуку; удасканаленне працы над дыханнем і плаўным гукавядзеннем. Выкарыстанне практыкаванняў на развіццё груднога рэзаніравання.

### *Тэма 7. Паступовае развіццё і пашырэнне дыяпазону*

Авалодванне рэгістравымі пераходамі. Ускладненне вакальных практыкаванняў (папеўкі больш шырокага дыяпазону, скачкі, розныя рытмічныя малюнкі, складаныя групоўкі нот, спалучэнні гукаў і складоў).

### *Тэма 8. Згладжванне рэгістравых пераходаў голасу*

Засваенне тэхналагічных прыёмаў развіцця дыяпазону. Удасканаленне вакальнай тэхнікі пры дапамозе практыкаванняў па выраўноўванні галосных па ўсім дыяпазоне, развіцці гібкасці і рухомасці голасу. Спевы складаных практыкаванняў для развіцця вакальнай тэхнікі.

## Раздзел III. Засваенне агульных і спецыфічных прыёмаў гукаўтварэння

### *Тэма 9. Авалоданне народна-выканальніцкімі прыёмамі*

Засваенне элементаў пластыкі, гульні. Уключэнне ў рэпертуар народных песень розных рэгіёнаў Беларусі з мэтай авалодання рэгіянальнымі выканальніцкімі прыёмамі (народныя мелізмы, спады голасу, агласоўка зычных, слізганні, глісанда і інш.).

### *Тэма 10. Знаёмства з характэрнымі прыёмамі гукаўтварэння*

Авалодванне метадамі народнага выканаўства. Засваенне ўсіх відаў атак: мяккай, цвёрдай, прыдыхальнай. Праца над мастацкім вобразам.

### *Тэма 11. Засваенне асаблівасцей дыялектаў*

Авалодванне спецыфікай вымаўлення. Перайманне народна-выканальніцкіх прыёмаў. Асаблівасці рэгіянальных гаворак, стыляў і азнаямленне з імі.

## Раздзел IV. Развіццё і ўдасканаленне вакальнай тэхнікі

### *Тэма 12. Удасканаленне вакальнай тэхнікі*

Пашырэнне дыяпазону, згладжванне рэгістравых пераходаў, развіццё груднога і галаўнога рэзаніравання. Выкарыстанне прыёмаў прыкрыцця гуку на верхніх нотах дыяпазону. Выкананне твораў у нюансах фортэ і піяна з улікам унутры іх дынамікі ў павольным, памераным, памерана-хуткім і хуткім тэмпах, уменне філіраваць гук. Удасканаленне дыкцыі і артыкуляцыі, апоры дыхання.

### *Тэма 13. Авалоданне сродкамі мастацкай выразнасці*

Праца над фразіроўкай, філіроўкай гуку. Выкарыстанне сродкаў мастацкай выразнасці (дынамічных адценняў, нюансаў, тэмпу і інш.) для перадачы зместу выконваемага твора. Вакальна-выканальніцкі аналіз выконваемых твораў.

### *Тэма 14. Праца над стварэннем мастацкага вобраза народнай песні*

Засваенне навыкаў імправізацыі. Выкарыстанне спецыфічных метадаў і кірункаў у інтэрпрэтацыі народнай песні. Пашырэнне дыяпазону груднога гучання ў межах сэптымы, актавы для жаночых галасоў; актавы, дэцымы для мужчынскіх галасоў; ужыванне складаных практыкаванняў для развіцця дыяпазону, рухомасці голасу, палётнасці, яскравасці.

### *Тэма 15. Выяўленне творчай індывідуальнасці выканаўцы*

Арганізацыя самастойнай работы спевака па падборы рэпертуару, стварэнні канцэртнай праграмы. Удасканаленне выканальніцкага і акцёрскага майстэрства.

## Раздзел V. Фарміраванне творчай асобы студэнта-спевака – выканаўцы народнай песні

### *Тэма 16. Фарміраванне артыста-спевака ў межах ВНУ*

Выхаванне творчай асобы выканаўцы народнай песні і яго ідэйна-мастацкага вобраза. Засваенне прыёмаў вакальна-выканальніцкай тэхнікі, паглыбленне ведаў у сферы народна-песеннага выканаўства.

### *Тэма 17. Удасканаленне вакальна-тэхнічных навыкаў і ўменняў*

Спевы складаных практыкаванняў на дыкцыю, дыханне, развіццё дыяпазону, рухомасць голасу. Пошук свайго выканальніцкага крэда. Удасканаленне вакальнай тэхнікі. Асэнсаванасць інтанавання музычна-паэтычнага тэксту, выразнасці і вобразнасці выканання.

### *Тэма 18. Падбор складанага і разнастайнага рэпертуару. Падрыхтоўка да дзяржаўнага экзамену*

Актыўная канцэртная дзейнасць. Арганізацыя самастойнай работы па стварэнні мастацкага вобраза песні, падборы рэпертуару, складанні канцэртнай праграмы. Развіццё прафесіяналізму ў народна-песенным выканаўстве.

На дзяржаўны экзамен выносяцца 8–10 твораў: народныя песні аўтэнтычныя і апрацаваныя, з суправаджэннем і без суправаджэння, арыгінальныя аўтарскія творы. Экзаменацыйная праграма павінна адпавядаць патрабаванням вучэбнага плана па падрыхтоўцы выканаўцаў народнай песні.

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА
## па вучэбнай дысцыпліне «Сольныя спевы»

| Назва тэмы, раздзела | Колькасць аўдыторных гадзін | УСР | Форма кантро-лю ведаў |
|---|---|---|---|
| | Індывідуальныя | | |
| **Уводзіны** | 1 | | |
| **Раздзел I. Развіццё практычных навыкаў сольных спеваў у народнай манеры** | | | |
| Тэма 1. Вызначэнне тыпу і характару голасу, тэмпераменту, артыстычных і музычных даных, індывідуальных недахопаў | 6 | | |
| Тэма 2. Набыццё навыкаў правільнага песеннага дыхання | 8 | | |
| Тэма 3. Вызваленне галасавога апарату ад напружанага гучання | 20 | 8 | паказ на уроку |
| Тэма 4. Удасканальванне дыкцыі, праца над словам | 29 | 6 | паказ на уроку |
| **Раздзел II. Засваенне тэхнікі сольных спеваў і вакальнага майстэрства** | | | |
| Тэма 5. Развіццё практычных навыкаў спеваў | 50 | 14 | вакальны трэнінг |
| Тэма 6. Развіццё груднога рэзаніравання | 16 | 4 | паказ на уроку |
| Тэма 7. Паступовае развіццё і пашырэнне дыяпазону | 18 | 4 | вакальны трэнінг |
| Тэма 8. Згладжванне рэгістравых пераходаў голасу | 18 | 2 | вакальны трэнінг |
| **Раздзел III. Засваенне агульных і спецыфічных прыёмаў гукаўтварэння** | | | |
| Тэма 9. Авалоданне народна-выканальніцкімі прыёмамі | 34 | 14 | рэферат |
| Тэма 10. Знаёмства з характэрнымі прыёмамі гукаўтварэння | 18 | 4 | залік |
| Тэма 11. Засваенне асаблівасцей дыялектаў | 10 | 4 | вакальны трэнінг |
| **Раздзел IV. Развіццё і ўдасканаленне вакальнай тэхнікі** | | | |
| Тэма 12. Удасканаленне вакальнай тэхнікі | 40 | 16 | вакальны трэнінг |
| Тэма 13. Авалоданне сродкамі мастацкай выразнасці | 30 | 4 | вакальны трэнінг |
| Тэма 14. Праца над стварэннем мастацкага вобраза народнай песні | 36 | 4 | паказ на уроку |
| Тэма 15. Выяўленне творчай індывідуальнасці выканаўцы | 20 | | |
| **Раздзел V. Фарміраванне творчай асобы студэнта-спевака – выканаўцы народнай песні** | | | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| Тэма 16. Фарміраванне артыста-спевака ў межах ВНУ | 20 | 2 | вуснае апытанне |
| Тэма 17. Удасканаленне вакальна-тэхнічных навыкаў і ўменняў | 20 | 10 | паказ на уроку |
| Тэма 18. Падбор складанага і разнастайнага рэпертуару. Падрыхтоўка да дзяржаўнага экзамену | 18 | 8 | вакальны трэнінг |
| **Усяго: 516** | **412** | **104** | |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

*Заседателев, Ф. Ф.* Научные основы постановки голоса [Электронный ресурс] / Ф. Ф. Заседателев. — 6-е изд., стер. — Санкт-Петербург: Планета музыки, 2024. — 112 с. — Режим доступа: https://e.lanbook.com/book/390347.

*Романовская, И. И.* Сольное пение. Постановка голоса [Электронный ресурс]: учеб.-метод. пособие / И. И. Романовская, И. И. Романовская. - Минск : БГУКИ, 2023. - 102 с.

*Сонки, С. М.* Теория постановки голоса в связи с физиологией органов воспроизводящих звук [Электронный ресурс]: учеб. пособие / С. М. Сонки. — 13-е изд., стер. — Санкт-Петербург : Планета музыки, 2022. — 184 с. — Режим доступа: https://e.lanbook.com/book/265280.

*Вучэбна-метадычная*

*Дмитриев, Л. Б.* Основы вокальной методики / Л. Б. Дмитриев. – М. : Музыка, 2000. – 367 с.

*Калугина, Н. В.* Методика работы с русским народным хором : учебник для муз. вузов / Н. В. Калугина. – М. : Музыка, 1977. – 255 с.

*Малышева, Н. М.* О пении: из опыта работы с певцами / Н. М. Малышева. – М. : Сов. композитор, 1988. – 135 с.

*Руднева, А. В.* Русский народный хор и работа с ним / А. В. Руднева. – М. : Сов. Россия, 1960. – 49 с.

*Шамина, Л. В.* Работа с самодеятельным хоровым коллективом / Л. В. Шамина. – М. : Музыка, 1983. – 175 с.

*Вопросы* вокальной педагогики : сб. ст. – М. : Гос. муз. изд-во, 1962. – Вып. 1. – 147 с.

*Крывіцкі, А. А.* Сучасная беларуская літаратурная мова і народныя гаворкі / А. А. Крывіцкі ; Т-ва па распаўсюджанні паліт. і навук. ведаў БССР. – Мінск, 1961. – 40 с.

*Медведева, М.* Методика хоровой аранжировки для руководителей фольклорных песенных коллективов / М. Медведева. – М. : ВНМЦ и КПР, 1982. – 87 с.

*Менабени, А. Г.* Методика обучения сольному пению : учеб. пособие для пед. ин-тов / А. Г. Менабени. – М. : Просвещение, 1987. – 93 с.

*Мешко, Н. К.* Искусство народного пения : практ. руководство и методика обучения искусству народного пения / Н. К. Мешко. – М. : ЛУЧ, 2000. – Ч. 2. – 80 с.

*Огороднов, Д. Е.* Воспитание певца в самодеятельном ансамбле / Д. Е. Огороднов. – Киев : Муз. Украина, 1989. – 66 с.

*Савельева, В. П.* Проблемы вокального обучения руководителей народных хоров / В. П. Савельева // Вопросы хорового образования : сб. тр. / М-во культуры РСФСР, Гос. муз.-пед. ин-т. – М., 1985. – Вып. 77. – С. 120–125.

*Стулова, Г.П.* Хоровое пение. Методика работы с детским хором: учебное пособие /Г.П. Стулова. – 2-е изд., стер. – Санкт-Петербург, издательство «Лань», издательство «Планета музыки», 2016. – 176 с.

*Холупава, Л. І.* Пастаноўка голасу і вакальны ансамбль : вучэб. дапам. / Л. І. Холупава, І. М. Грамовіч, Л. Л. Ражкова. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – 189 с.

*Дадатковая*

*Беларускі* фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Гомельская вобласць / уклад. В. А. Захарава, Р. М. Кавалёва, В. Д. Ліцвінка. – Мінск : Універсітэцкае, 1989. – 384 с.

*Беларускі* фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Мінская вобласць / уклад. В. Д. Ліцвінка, Г. Д. Кутырова. – Мінск : Універсітэцкае, 1995. – 250 с.

*Варфаламеева, Т. Б.* Песні Беларускага Панямоння / Т. Б. Варфаламеева. – Мінск : Беларус. навука, 1980. – 220 с.

*Вянок* беларускіх народных песень / запіс У. Раговіча. – Мінск : Навука і тэхніка, 1988. – 432 с.

*Елатов, В. И.* Песни восточнославянской общности / В. И. Елатов. – Минск : Наука и техника, 1977. – 245 с.

*Емельянов, В. В.* Фонопедический метод формирования певческого голосообразования / В. В. Емельянов. – Новосибирск : Наука. Сибирское отд., 1991. – 39 с.

*Мажэйка, З. Я.* Песні Беларускага Паазер'я / З. Я. Мажэйка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – 493 с.

*Можейко, З. Я.* Песни Белорусского Полесья / З. Я. Можейко. – М. : Сов. композитор, 1983. – Вып. 1. – 184 с.

*Можейко, З. Я.* Песни Белорусского Полесья / З. Я. Можейко. – М. : Сов. композитор, 1984. – Вып. 2. – 181 с.

*Мажэйка, З. Я.* Песні Беларускага Падняпроўя / З. Я. Мажэйка, Т. Б. Варфаламеева. – Мінск : Беларус. навука, 1999. – 276 с.

*Раговіч, У. І.* Песенны фальклор Палесся. Песні святочнага календара / У. І. Раговіч. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2001. – Т. 1. – 526 с.

*Традыцыйная* мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / уклад. Т. Б. Варфаламеева. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – Т. 1: Магілёўскае Падняпроўе. – 796 с.

## Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці

*Асноўнымі сродкамі дыягностыкі* з'яўляюцца:

- Кантроль за самастойным выкананнем заданняў на развіццё і ўмацаванне дыхання, дыкцыі, інтанацыі;
- тэматычны фестываль-канцэрт;
- тэхнічныя залікі.

## Метадычныя ўказанні па арганізацыі самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа студэнтаў з'яўляецца часткай вучэбнай дзейнасці і мае мэтай паглыбленне і замацаванне атрыманых кампетэнцый, самастойны пошук і набыццё новых ведаў. Прызвана садзейнічаць фарміраванню навыкаў самастойнай работы ў вучэбнай і прафесійнай дзейнасці студэнта.

Самастойная работа студэнтаў прадугледжвае работу з вучэбна-метадычнымі выданнямі, навуковымі крыніцамі, пошук і аналіз дадатковай літаратуры па тэмах дысцыпліны.